**Мануал па праблемна-арыентаванаму навучанню**

| | <u>**Занятак 1 “Знаёмства”**</u> |
|---|---|
| Час: | 45 хвілін |
| Мэты: | Пасля завяршэння гэтага занятку ўдзельнікі змогуць:<br>● пазнаёміцца і даведацца больш пра іншых удзельнікаў;<br>● падзяліцца асабістай інфармацыяй, хобі і здольнасцямі з іншымі;<br>● ініцыяваць і ўзгадніць правілы падчас навучання;<br>● у супрацоўніцтве з выкладчыкам прапанаваць мэты навучання. |
| Матэрыялы: | Аркушы паперы на групу, маленькія лісточкі для асабістых сімвалаў, маркеры, скотч |
| Крокі: | 1. Дайце каляровую паперу і папрасіце ўдзельнікаў напісаць свае імёны (ВЯЛІКІМІ літарамі); успомніць хоббі, намаляваць асацыяцыю, звязаную з паняццем “праблемна-арыентаванае навучанне”.<br>2. У парах удзельнікі абменьваюцца асабістай інфармацыяй і чаканнямі ад удзелу ў семінары, паказваюць сімвалы.<br>3. У групе прадстаўляюць свайго партнёра іншым, выкарыстоўваючы сабраную інфармацыю.<br>4. Абмяркуйце з педагогамі некалькі правіл, якіх трэба прытрымлівацца для эфектыўнай працы і камфорту ў аўдыторыі.<br>5. Папрасіце на вялікім аркушы намаляваць агульны сімвал “ПАН”<br>6. Выябрыце таго, хто прадставіць інфармацыю. |
| | **Занятак 2 “Асноўныя канцэпцыі ПАН”** |
| Час: | 90 хвілін |
| Мэты: | Пасля завяршэння гэтага практыкавання слухачы змогуць:<br>● уявіць і ўзгадніць некаторыя канцэпцыі і тэрміналогію ПАН<br>● (праблема, сітуацыя, праблемная сітуацыя, узнікненне праблемы, метады выкладання і вырашэння праблем і т. д.);<br>● карыстацца рэсурснымі матэрыяламі (раздатачны матэрыял, інтэрнэт і г. д.). |
| Матэрыялы: | Папера А1, маркеры. |

| | |
|---|---|
| Крокі: | 1. Падзяліце аўдыторыю на групы і размяркуеце заданні для кожнай групы (кожная група вывучае адно паняцце).<br>2. Папрасіце слухачоў абмеркаваць і напісаць на аркушы A1 свае ўласныя вызначэнне дадзенага паняцця.<br>3. Групы робяць прэзентацыю па кожным вызначэнні; выкладчык абмяркоўвае і ўзгадняе асноўны змест кожнага паняцця, звяртае ўвагу на канцэпцыі, на падставе якіх будуецца ПАН.<br>5. Раздайце працоўныя лісты і папрасіце групы іх запоўніць.<br>6. Падагульніце паняцці. Засяродзьцеся на асноўных характарыстыках ПАН. |
| Ацэнка: | Спытайце слухачоў аб асноўных характарыстыках і асаблівасцях ПАН.<br>Потым выкладчык можа прапанаваць правесці самаацэнку ўзроўню засваення асноўных вызначэнняў і канцэпцый ПАН адносна мэтаў. |
| Рэсурсы | http://surl.li/olgkzn<br>https://ahaslides.com/ru/blog/problem-based-learning/;<br>https://eduspace.pro/project-based-learning;<br>https://expert.itmo.ru/project-learning;<br>https://skillbox.ru/media/education/kakie-byvayut-metody-obucheniya-ot-klassicheskikh-do-sovremennykh/ |
| | **Занятак 3 “Моцныя і слабыя бакі ПАН”** |
| Час: | 90 хвілін |
| Мэты: | Пасля завяршэння гэтага занятку ўдзельнікі змогуць:<br>● назваць моцныя і слабыя бакі ПАН.<br>● прапанаваць рашэнні пэўных праблем, звязаных з укараненнем ПАН. |
| Матэрыялы: | Папера фармату A1, маркеры, фліпчарт,<br>Інфармацыя аб моцных і слабых баках *(Дадатак 1).*<br>Прыклады заданняў *(Дадатак 2).* |
| Крокі: | 1. Падзяліце аўдыторыю на групы па чатыры чалавекі. У групе неабходна выбраць лідара і сакратара для запісу інфармацыі.<br>2. Размяркуйце групы для рашэння першага задання *(А. “Перавагі і недахопы ПАН”)*<br>3. Накіроўвайце слухачоў самастойна вырашаць праблему.<br>4. Дайце больш складаную другую задачу групам *(В. “Узор заданняў”).*<br>6. Уважліва накіроўвайце слухачоў да вырашэння прапанаваных заданняў. Калі неабходна, забяспечце іх рэсурснымі матэрыяламі. |

| | |
|---|---|
| | 7. Абмяркуйце пазнавальны працэс з дапамогай рашэння праблемных задач і параўнайце яго з традыцыйнымі падыходамі.<br>8. Папрасіце групы паразважаць аб моцных і слабых баках ПАН<br>9. Абмяркуйце разам перавагі і праблемы ПАН. Рабіце нататкі на фліпчарце.<br>10. Прааналізуйце асноўныя моцныя і слабыя бакі ПАН, абмяркуйце неабходныя рашэнні, дзе неабходна рабіце нататкі. |
| Ацэнка: | Разгляд усёй інфармацыі, прадстаўленай кожнай групай. Метад “Ратацыі”<br>Заўвагі: спрыяйце ўпэўненасці ўдзельнікаў у сабе і падкрэслівайце іх моцныя бакі. |

*Дадатак 1* – Рэсурсны матэрыял для занятку 3

**А. “Перавагі і недахопы ПАН”**

| № | ЗМЕСТ | АЦЭНКА | |
|---|---|---|---|
| | | Перавагі | Недахопы |
| 1. | Навучэнцы атрымліваюць веды па тэме ўрока, шляхам рашэння вучэбнай праблемы. | | |
| 2. | Навучэнцы могуць займацца на ўроку зусім не тым, што хоча настаўнік | | |
| 3. | Вучні працуюць над рашэннем вучэбнай праблемы цалкам незалежна ад настаўніка. Такім чынам, іх цяжка пракантраляваць | | |
| 4. | Спрыяе актыўнаму вучэнню і навучанню | | |
| 5. | Настаўнік дапамагае навучэнцам самастойна развіваць здольнасці | | |
| 6. | Слабыя або няўпэўненыя вучні могуць ціха адседзецца, бо іншыя члены групы могуць браць ініцыятыву ў пошуку рашэння вучэбнай праблемы на сябе. | | |
| 7. | З дапамогай ПАН вучні інтэгруюць веды з рэальным жыццем. | | |
| 8. | Калі настаўнік не ажыццяўляе строгі кантроль, вучні могуць памыляцца ў сваіх высновах. | | |
| 9. | Некаторыя навучэнцы не могуць прывыкнуць да гэтага метаду навучання | | |
| 10. | ПАН дапамагае навучэнцам зразумець значнасць вучэбнага прадмета | | |
| 11. | Развівае крытычнае мысленне, адказнасць, самастойнае навучанне і гнуткасць. | | |
| 12. | Планаванне і рэалізацыя ПАН патрабуе часу | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 13. | Дапамагае настаўнікам развіваць у вучняў кампетэнцыі. | | |
| 14. | Дапамагае вучням living рознымі спосабамі вырашаць праблемы з рэальнага жыцця. | | |
| 15. | Заахвочвае супрацоўніцтва і дыскусіі - аснову для развіцця жыццёвых навыкаў | | |
| 16. | Цяжка вылучыць вучэбныя праблемы для вырашэння | | |
| 17. | Неабходна, каб настаўнік і вучні мелі даследніцкія навыкі вырашэння вучэбных праблем. | | |
| 17. | ПАН дапамагае навучэнцам быць упэўненымі ў розных жыццёвых сітуацыях | | |

*Дадатак 2* – Узор заданняў

В. УЗОР ЗАДАННЯЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЛЕКСІЧНАЯ ТЭМА – “ХЛЕБ”

**1.** Прачытайце тэкст. Вызначце, пра якія злакавыя расліны ідзе гаворка ў тэксце. Устаўце патрэбныя словы.

Даспела збажына. Шчыльнай сцяной, у рост дарослага чалавека, стаіць .............. Сама назва гэтай расліны пра сябе гаворыць: ................. – жыццё. Блізкія словы.

..................... – тая крыху ніжэйшая. І .........., і .............. галоўным чынам на хлеб ідуць. З жытняй мукі чорны хлеб пякуць. З пшанічнай – белы.

А вунь ................... Ростам ён яшчэ ніжэйшы за пшаніцу. І колас у яго не тугі, а развесісты. Затое вусы–асцюкі – ух, якія калючыя! З ............... геркулес робяць. А каша з геркулесу і смачная, і карысная. Хто есць яе, той расце, як кажуць, не па днях, а па гадзінах, і сілы хутка набіраецца (А. Вольскі).

2. Уявіце, што вы праязджаеце каля поля. Пазнайце па апісанні расліны.

1)



(пшаніца )

2)

 (Авёс)

3)

 (жыта)

3. Да вас прыехалі госці з Францыі і заўважылі, што беларусы ў сваім маўленні “акаюць”. Вы ім тлумачыце гэтую арфаэпічную асаблівасць беларускай мовы і прыводзіце для доказу словы Рыгора Барадуліна:

Пракрычаў арол з-пад неба:
- Беларусу акаць трэба.

Прывядзіце прыклады слоў з тэксту для доказнасці.

4. Уявіце, што вы адкрываеце магазін “Хлебніца”, дзе абслугоўванне пакупнікоў вядзецца на беларускай мове. Перакладзіце на беларускую мову найменні хлеба-булачных вырабаў. Правільна афармляйце на пісьме прыдаткі.

Хлеб диетический
Хлеб бородинский
Хлеб самородок с семечками
Лаваш гродненский
Батон лазурный

“КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫЯ ЗАДАННІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ”.– *Лойша Т.В., настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Сярэдняя школа №41 г.Гродна”.* – Рэжым доступа :[https://groiro.by/files/01030/obj/110/17173/doc/Loysha-T.V.-Kampetentnasna-aryentavanyya-zadann.doc](https://groiro.by/files/01030/obj/110/17173/doc/Loysha-T.V.-Kampetentnasna-aryentavanyya-zadann.doc)

| | **Занятак 4 “Асноўныя навыкі”** |
|---|---|
| Час: | 180 хвілін |
| Мэты: | Пасля завяршэння гэтага занятку ўдзельнікі змогуць:<br>● патлумачыць, што такое вучэбная праблема і назваць розныя ўзроўні праблем;<br>● прадставіць асноўныя навыкі ў ПАН, засяродзіўшы ўвагу на навыках пошуку праблем;<br>● прымяніць атрыманыя веды на канкрэтных прыкладах;<br>● прывесці прыклады розных узроўняў вучэбных праблем адносна прадмета, які выкладаюць. |
| Матэрыялы: | Аркушы А1, фліпчарт, маркеры, раздатачныя матэрыялы *(Дадатак 3)* на групу, палоскі з напісаныміі імёнамі слухачоў. |
| Крокі: | 1. Падзяліце аўдыторыю на прадметныя групы (пачатковыя класы, фізіка, гісторыя, мова і літаратура, хімія і г.д.).<br>2. Расскажыце пра вызначэнне праблемы і розныя тыпы задач. *(Дадатак 3)*. Прывядзіце адзін прыклад для кожнага ўзроўню.<br>3. Папрасіце прывесці прыклады трох узроўнеў праблемных задач па тым прадмеце, які выкладаюць.<br>4. Запісаныя прыклады размясціце ў аўдыторыі і дайце слухачам магчымасць пахадзіць і пазнаёміцца з прыкладамі, сфатаграфаваць іх. (Метад “Галерэя”)<br>5. Раскажыце пра патрабаванні да праблемных «задач», якія выкарыстоўваюцца для выкладання і навучання.<br>6. Абмяркуйце са слухачамі асноўныя навыкі, неабходныя вучням для праблемна-арыентаванага навучання.<br>7. Раздайце лісты і папрасіце слухачоў апісаць і прывесці прыклады праяўлення наступных навыкаў:<br><br>а. пошук праблемы;<br>б. рашэнне задач, прывядзенне прыкладаў;<br>в. складанне карты мыслення, кластару;<br>г. выдвіжэнне гіпотэз (здагадак);<br>д. сістэмнае мысленне;<br>е. стварэнне “Дрэва праблем”;<br>ж. выкарыстанне лагічных структур.<br>5. Групы запаўняюць працоўны ліст па зададзеным навыку, прэзэнтуюць прыклад прымянення, абмяркоўваюць і робяць высновы пасля кожнага прадстаўленага навыка. |

| | |
|---|---|
| | 6. Абагульніце групы ўменняў і зрабіце асноўныя запісы на фліпчарце аб іх прымяненні. |
| Ацэнка: | Спытайце слухачоў аб значэнні кожнага навыку для фарміравання ўніверсальных кампетэнцый. Можна выкарыстаць правіла “непадымання рукі”, калі выпадковым выбарам выкладчык выцягвае палоску з напісаным прозвішчам слухача. |

*Дадатак 3* – Рэсурсны матэрыял для занятку 4

АСНОЎНЫЯ НАВЫКІ ДЛЯ ПРАБЛЕМНАГА НАВУЧАННЯ

**А. ВЫЗНАЧЭННЕ І ТЫПУ ЗАДАЧ**

1. Што такое праблема?

Праблема - гэта нейкая неадпаведнасць нашых ведаў аб аб'екце, штодзённым уяўленням, разумнаму сэнсу. Гэта нейкі парадокс, супярэчнасць: “Праблема - гэта тое, што ёсць, але быць не павінна, або тое чаго няма, але павінна быць”. (Вікіпедыя)

2. Віды задачы2

Ёсць тры тыпы задач у залежнасці ад здольнасцяў навучэнцаў:

**<u>Тып 1:</u> Прыкладны'я задачы (узровень 1)**

Прыкладныя заданні даюцца ў канцы ўрока або раздзела і адказ на іх можна знайсці ў падручніку, або рабочым сшытку.

На гэтым узроўні рашаецца задача - развіць узровень ведаў і разуменне навучэнцаў.

Заданне:

Прыклад 1:

Простая схема, як паказана на дыяграме




Заданне: Разлічыце сілу электрычнага току, які праходзіць праз засцерагальнік, лямпу, прас і электрычную пліту.

**<u>Тып 2:</u> Гісторыі, звязаныя з рэальным жыццём (КАЗ), заснаваныя на вучэбных фактах (узровень 2)**

Міхась прачнуўся раней за ўсіх членаў сям’і, уключыў лямпу на 100 Вт. Ён хацеў здзівіць сваіх блізкіх і зварыць каву, уключыў электрычню пліту на 1000 Вт. Адначасва ён хацеў папрасаваць сваё адзенне і выкарыстаў для

гэтага прас на 1500 Вт. Аднак, у электрычным ланцугу быў засцерагальнік толькі на 20 ампер. Ці варта Міхасю спачатку зварыць каву, а затым папрасаваць адзенне?

**<u>Тып 3:</u> Рэальныя жыццёвыя сітуацыі (узровень 3)**

Гэта самы складаны ўзровень “праблемы” і жаданы ўзровень для ПАН. На гэтым узроўні, вырашаючы праблему, вучні развіваюць больш высокія разумовыя навыкі, такія як аналіз, сінтэз і ацэнка, з дапамогай вывучэння, даследавання і вырашэння праблем.

У гэтых сітуацыях вучні сутыкаюцца з ведамі, якія раней былі для іх невядомыя. Для вырашэння праблемы вучням неабходна абапірацца на веды з розныз прадметаў, а таксама мець тэарэтычныя веды і пэўныя навыкі.

Заданні тыпу 1 могуць быць адаптаваны да тыпу 3, калі дадзеная задача змяшчае веды незнаёмыя навучэнцам.

Прыклад 1:

Частка 1:

Ваш настаўнік пабудаваў свой дом. Вы добры вучань з добрымі ведамі аб электрычных сістэмах у дамах. Вы прапанавалі дапамагчы спраектаваць электрычную сістэму для яго дома, і ён пагадзіўся. У доме 4 пакоі, 1 гасцёўня, 1 сталовая і 2 прыбіральні. Ваш настаўнік - настаўнік мовы і літаратуры. Ён нават не ведае, як працуе засцерагальнік, колькі спатрэбіцца электраабсталявання, засцерагальнікаў; як будзе пракладзены электрычны провад ды інш.

*(ПРАШУ ПРАБАЧЭННЯ Ў НАСТАЎНІКАЎ МОВЫ і ЛІТАРАТУРЫ, бо яны могуць добра разбірацца ў электрычнасці).*

Адкажыце на пытанні настаўніка аб бытавых электрычных сістэмах. Калі ў вас няма адказаў, шукайце дадатковую інфармацыю. Каб выканаць заданне, вам трэба спытаць у экспертаў (настаўнік фізікі, інжынера-электрыка, бацькоў…) дадатковую інфармацыю, знайсці артыкулы на гэту тэму ў інтэрнэце, паглядзець YouTube, ці відэаблог па дадзенай тэме. (Калі вы скончыце частку 1, вам будзе прадастаўлена частка 2).

Частка 2:

Настаўнік мовы і літаратуры раскажа вам пра электрычнае абсталяванне, якое выкарыстоўваецца ў яго доме, у тым ліку мікрахвалёўка, халадзільнік, духоўка, электрычная пліта, посудамыйная машына на кухні; кампутар, прынтэр, прас, тэлевізар у спальні; фен, воданагравальнік; лямпа і бра ў кожным пакоі (акрамя ваннай). Плошча пакояў наступная:
Кухня: 3м. х 4м.; гасцёўня 4м. х 5м.; спальня 3м. х 3м.; прыбіральня: 1,5м. х 2 м. Колькі электрычных разетак спатрэбіцца? Неабходна спраектаваць схему для кухні. Ці патрэбны засцерагальнікі для ланцуга кухні? Спраектуйце ўсю схему для дома.
(Калі вы скончыце заданне, папрасіце настаўніка мовы і літаратуры аб каментарах наконт выкананай працы).

**Б. ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧЭБНЫХ ПРАБЛЕМНЫХ ЗАДАЧ**

«Праблема» - гэта *інструмент, кантэкст* і *сітуацыя* для вучняў, каб атрымаць прадметныя веды і кампетэнцыі.

Такім чынам, «праблема» з'яўляецца найбольш важным фактарам, які трэба вызначыць. Эфектыўнасць ПАН залежыць ад якасці задач, якія даюцца вучням.

Добрая «праблема»:

- павінна ўтрымліваць супярэчнасць, канфлікт, выклік, які паказвае вучням, што наяўных ведаў недастаткова, каб яе вырашыць;
- засноўвацца на змесце навучання;
- звязаная з рэальным жыццём;
- дапамагае ў развіцці больш высокага ўзроўню мыслення;
- выклікае інтарэс і матывуе вучняў;
- заахвочвае да супрацоўніцтва.

**В. МЕТАДЫ ВЫЗНАЧЭННЯ ПРАБЛЕМЫ**

***Варыянт № 1: пастаноўка задачы з выкарыстаннем паняццяў/прынцыпаў***

- Зыходзячы са зместу ўрока, настаўнік выбірае асноўныя паняцці і прынцыпы (невядомыя навучэнцам).
- Затым настаўнік стварае 3 ўзроўні «праблемы»: "прыкладны'я заданні" (узровень 1), "гісторыі, звязаныя з рэальным жыццём" (узровень 2) і "рэальныя жыццёвыя сітуацыі" (паказ існавання паняццяў/прынцыпаў у рэальным жыцці (узровень 3).

***Варыянт № 2: высветліць існаванне паняццяў/прынцыпаў у рэальным жыцці***

Вучні вывучаюць і выяўляюць вучэбныя праблемы ў рэальных падзеях; навуковыя паняцці ў паўсядзённым жыцці.

Прыклад: нямецкі фізік Ф. А. Кекуле ўспамінаў: «Я ўбачыў клетку з малпамі, якія лавілі адзін аднаго, то схопліваючыся паміж сабой, то зноў расчапляліся, і адзін раз схапіліся такім чынам, што склалі кола… Такім чынам пяць малпаў, схапіўшыся, утварылі кола, і ў мяне адразу ж бліснула ў галаве думка: вось выява бензолу».

А. Ф. Кекуле зрабіў навуковае адкрыццё на аснове метаду аналогіі, які адносіцца да групы ўніверсальных метадаў навуковага пазнання.

(па матэрыялах: https://inlnk.ru/n0LBNZ)

Рэсурсы, якія змяшчаюць «праблему», ўключаюць кнігі, часопісы, газеты, тэлебачанне, інтэрнэт, асабісты вопыт, даследаванні ды інш.

***Варыянт № 3: Вывучэнне супрацьлеглых фактараў***

Спосаб даследаваць праблемы ў розных аспектах у рэальным жыцці, калі ёсць супярэчнасці паміж тым, што павінна адбыцца, і тым, што адбываецца ў рэчаіснасці.

Прыклады:

*супярэчнасць паміж тэорыяй і рэальным жыццём:* узровень халестэрыну ў чалавека павінен павышацца, калі ён есць шмат яек. Аднак некаторыя людзі, якія з'ядаюць 20 яек на тыдзень на працягу дзясяткаў гадоў, маюць нармальныя паказчыкі халестэрыну ў іх крыві.
*Супярэчнасць паміж тэорыяй і тэхналогіяй:* каб расліны раслі, трэба ствараць і падтрымліваць добрыя ўмовы вады, святла і ўгнаенняў. Аднак, некаторыя расліны ўсё роўна гінуць, нягледзячы на ўсе гэтыя ўмовы.

Важным пытаннем, якое трэба мець на ўвазе пры выбары праблемнай задачы, з'яўляецца: "Якія кампетэнцыі атрымаюць вучні, рашаючы гэтую задачу?" Праблема павінна дапамагчы навучэнцам замацаваць наяўныя і атрымаць новыя веды.

| | **Занятак 5** "Распрацоўка плана ўрока" |
|---|---|
| Час: | 60 хвілін |
| Мэты: | Пасля завяршэння гэтага занятку ўдзельнікі змогуць:<br>● прымяняць атрыманыя веды і навыкі пры распрацоўцы планаў урокаў ПАН;<br>● змогуць распрацаваць план урока ПАН для пэўнай тэмы адпаведна вучэбнай праграме па вучэбнаму прадмету, які выкладаюць. |
| Матэрыялы: | Матэрыял для трэнераў і слухачоў, працоўныя аркушы і рэсурсныя матэрыялы (*Дадатак 4*).<br>Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Аб арганізцыі ў 2024/2025 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі (аульная частка); вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах. http://surl.li/uksjsr |
| Крокі: | 1. Раздзяліце аўдыторыю на прадметныя групы і размяркуйце заданні для кожнай групы.<br>2. Накіроўвайце групы да ўважлівага чытання адпаведнай інфармацыі.<br>3. Папрасіце распрацаваць план урока па прадмету і канкрэтнай тэме ў межах КТП<br>4. Прапануйце прыкладны ўзор плана ўрока.<br>5. Прадстаўнікі груп прадстаўляюць вынікі сумеснай працы.<br>6. Групы абмяркоўваюць і дадаюць зваротную сувязь.<br>7. Падвядзенне вынікаў працы, рэфлексія, |
| Ацэнка: | Ацэнка ўзроўню засваення слухачамі зместу планаў урокаў ПАН праз прыклады распрацаваных урокаў. |

*Дадатак 4*

# ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН УРОКА

## I. АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ

Падрыхтавалі____________________

Прадмет ________________________

Клас___________________________

Тэма___________________________

Дата___________________________

## II. МЭТЫ

1. Веды________________________
2. Навыкі______________________
3. Стаўленне____________________

## III. ВУЧЭБНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДЛЯ ДАСЛЕДВАННЯ

1. Стварэнне праблемнай сітуацыі, увядзенне праблемнай задчы
2. Дызайн асноўных пытанняў да гэтага ўрока (ключавыя, праблемныя, адкрытыя, закрытыя і г.д.)
3. Што вучні ўжо ведаюць па тэме? На якія ўменні можна арыентавацца пры планаванні ўрока?
4. Якімі ведамі і ўменнямі вучні не валодаюць?
5. Накіроўваючыя пытанні
6. Метады ПАН
7. Неабходныя навыкі
8. Сумежныя прадметныя вобласці (калі ёсць)
9. Рэсурсы (дадатковыя да падручніка)
10. Ацэнка вынікаў рашэння праблемнай задачы

## IV. АБ'ЕКТЫ І ПАДРЫХТОЎКА

1. Падрыхтоўка настаўніка
2. Падрыхтоўка, зробленая вучнямі

## V. РЭАЛІЗАЦЫЯ

| ЭТАПЫ | ЗМЕСТ | ДЗЕЙНАСЦЬ | | ЧАС |
|---|---|---|---|---|
| Вызначэнне і вывучэнне праблемы | | НАСТАЎНІК | ВУЧАНЬ | |
| Пошук адпаведнай інфармацыі | | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Рашэнне праблемы | | | | |
| Прадстаўленне вынікаў | | | | |